Разьвінайцеся ў сталінскім паходзе!

**Чацьвёрты заключны глядзіць у твар,
Вырастае яго дужая постаць.**

**Мацуйце, таварышы, гарт,
Мацуйце ўдарны поступ.**

ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

30 лістапада 1931 г.
№ 276 (1545)

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦК І МЕНГАРКОМУ ЛКСМБ



8-ая комсамольская істужка Віцебскай ф-кі „Сьцяг Індустрыялізацыі" дзякуючы ўвядзеньню гаспадарчага разрахунку, зьменна-сустрэчным плянам,—выканала прамфінплян за першае паўгодзьдзе на 115 проц.

Сакрэт перамогі крыецца ў опэрацыйным, штодзённым кіраўніцтве адміністрацыйна - тэхнічнага пэрсоналу, рабоце па-новаму ўсяго колектыву. Рабочыя 8 комсамольскай істужкі абавязаліся скончыць плян 4 кварталу на 10 дзён раней тэрміну і свае абавязацельства выконваюць.

...ньня на ганаровы сьпіс Ста...кага паходу занесена 8-я мала...ая істужка Віцебскай фабры... „Сьцяг індустрыялізацыі".

...я маладзёжная, рэалізуючы ...азаньняў тав. Сталіна, здолела ...асова выправіць недахопы і ...арнаму разгарнуць сваю рабо...

...ўтра пачынаецца апошні месяц ...рашаючага. месяц, які паві...в посьпехам вырашыць пляны ...шэньня фундаманту соцыялістычнай экономікі.

...глебе рэалізацыі ўказаньняў ...Сталіна рабочая кляса дабі... вялікіх посьпехаў у барацьбе ...льшавіцкія пляны. На гэтай ...вылечыў сваю „гвіпячую хва...“ Сталінградзкі трактарны, ...за ўзьняў здабычу Донбас, з ...ехам выконвае свае пляны ...прадпрыемстваў і галін прамы...сьці Савецкай Беларусі.

...ні год пацігодзі характэрны ...ам 518 новых фабрык і заво... пускам 1040 „машына-трактар... станцый. Пачалі сваю работу ...ія в гэтых 518.

...рамысловасьць увайшла ў самы ...зны пэрыод сваёй дзейнасьці. ...я фабрыкі і заводы ўвайшлі ў ...званы пускавы пэрыод, калі ...ана быць скончана ўся будаў... і монтажная работа, а ўкла...ыя ў будаўніцтва сродкі—даць рэальныя вынікі.

...ты пэрыод характэрны асабліва ...тай барацьбою за поўнае вы...ньне народна-гаспадарчага пляну 1931 году і асабліва яго якасных паказчыкаў.

...згорнуты па ініцыятыве „Комсамольскай праўды" ўсесаюзны ста...скі паход павінен арганізаваць ...масу комсамольцаў і рабочае ...модзі на пасьпяховае выкананьне ...начаных плянаў.

...ыступіўшы ва ўсесаюзны паход ...амолу, кожны комсамолец і ма... рабочы павінен цьвёрда ве... свае месца і свае задачы ў ...не рэалізацыі 6 гістарычных ...аньняў тав. Сталіна. Кожны ...амолец павінен зараз, і асабліва зараз, перад пачаткам новага ...адарчага году ведаць і змагацца асноўныя прынцыпы гаспадарчага разрахунку. Ні для каго ...акрэт, што рад гаспадарча-раз...нковых брыгад ня выконвае свайго прамфінпляну.

...самольская гаспадарча-разрахун...кая брыгада ня можа ня выка...наць свой прамфінплян! Для гэтага ў ...яўнасьці ўсе магчымасьці.

...нароўы сьпіс сталінскага паходу-кантрольны пост. У ганаровым сьпісе атрымаюць сабе места тыя комсамольскія колектывы, брыгады і ...хі, якія лепш арганізуюць сваю работу, стануць прыкладам для ўсіх астатніх, пойдуць у авангардзе ўсесаюзнага сталінскага.

...сесаюзны сталінскі паход комсамолу распачаўся. Сьнежань месяц—ударны этап сталінскага паходу. З гонарам скончыць ударны этап, выканаць пляны завяршэньня фундаманту соцыялістычнай эканомікі—ў гэтым ганаровая задача комсамолу, з гэтай задачай справіцца па-бальшавіцку.

На абвестку дня не пастаўлен транспорт

Гомельскі гаркамол ня кіруе комсамольскай організацыяй чыгункі, замазвае яе прарывы

Опэрацыйным, конкрэтным кіраўніцтвам ліквідаваць прарыў

На 9 вучастку цягі—прарыў

Комсамолія вучастку дрэнна змагаецца за рэалізацыю загаду т. Андрэева

Кіраўніцтва некаторых колектываў і ячэек Гомельскага чыгуначнага вузла і гарком ЛКСМБ не мобілізавалі комсамольскую організацыю 9-га вучастку цягі, заводу „Ланцуцкага" і інш. на ажыцьцяўленьне загаду т. Андрэева, на рэалізацыю важнейшых дырэктыў партыі і ўраду аб транспорце.

Гарком комсамолу толькі 31-га кастрычніка вынес пастанову аб рэалізацыі загаду т. Андрэева, колектыў 9-га вучастку цягі вынес адпаведныя рашэньні толькі 11 лістапада. Але ўсе гэтыя пастановы не рэалізаваны. Колектыў заводу „Ланцуцкага" толькі зараз намячае конкрэтныя мерапрыемствы па ўдзелу комсамольскіх ячэек у ажыцьцяўленьні загаду т. Андрэева.

Опортуністычнае кіраўніцтва комсамолу і паасобных ячэек прывяло да таго, што комсамольская ўдарная скразная брыгада, якая у свой час зьяўлялася прыкладам для ўсяго дэпо, зараз распалася.

Комсамольскі паравоз сэрыі ОЧ-2 ужо больш 2 дзён не працуе, а комсамольскія брыгады прымацаваны да другіх паравозаў.

У дэпо значна зьнізілася комсамольская і вытворчая дысцыпліна. Сярод комсамольцаў шмат прагульшчыкаў. 8-га лістапада сэкратар цэхячэйкі ступеньчатага дэпо, т. Сушкевіч, сам зрабіў прагул.

Комсамолец Кіўла С. рамантаваў інжэктар 2 разы, комсамолец Савінкаў—цыліндровыя краны 2 разы Такіх фактаў можна знайсьці шмат

У дэпо і да гэтага часу варштаты і інструманты абязьлічаны. Комсамольцы на гэта не рэагуюць.

Пастанова бюро ЦК ЛКСМБ, вынесеная па дакладу Гомельскага гаркому і колектыву 9 вучастку цягі, ляжыць у стале сэкратара колектыву т. Сушанскага.

Сэкратар гаркамолу т. Камісарчык і сэкратар колектыву т. Сушанскі не патурбаваліся давесьці гэтую важнейшую пастанову да мас комсамольцаў чыгуначнікаў.

31-га кастрычніка бюро гаркому вынесла пастанову аб рэалізацыі загаду Андрэева. Бюро колектыву цягі была вынесена вымова. Але ні аб гэтым спагнаньні, ні аб гэтай пастанове ня ведаюць комсамольцы 9-га вучастку цягі.

Верасень і кастрычнік месяцы зьяўляліся ўдарнымі ў падрыхтоўцы ўсяго чыгуначнага транспорту да асеньне-зімовых перавозак, але на 9-м вучастку цягі на працягу 2 месяцаў ня было ніводнага сходу.

Ня глядзячы на пастановы ЦК Усе ЛКСМ і ЦК ЛКСМБ аб перабудове комсамольскай работы на транспорце, да гэтага часу пэнтр цяжару не перанесен у групу, брыгаду. На важнейшым вучастку—службе руху—не організавана комсамольская ячэйка.

Кастусёў.

Гомельскі горкамол ня кіруе ячэйкамі на транспорце

„Аб'яднаны пленум катэгорычна патрабуе ад усіх мясцовых парторганізацый палепшаньня і дыфэрэнцыяцыі кіраўніцтва паасобнымі галінамі транспорту, папярэджваючы, што пры ацэнцы работы мясцовых парторганізацый ЦК і ЦКК будуць улічваць становішча і работу транспорту на мясцох". (З пастановы аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б аб чыгуначным транспорце).

Як-жа гомельскі гаркамол рэалізуе гэты важнейшы пункт пастановы пленуму ЦК КП(б)Б?

Матар'ялы, зьмешчаныя сёньня з усёй яскравасьцю сьведчаць аб тым, што з-за опортуністычнага комсамольскага кіраўніцтва 9-га вучастку цягі організацыя шчыльна не падышла да практычнай рэалізацыі загаду т. Андрэева.

Замест дапамогі і кіраўніцтва гэтымі ячэйкамі, замест рашучай барацьбы з праваопортуністычнымі тэндэнцыямі кіраўніцтва комсамольскіх організацый чыгункі, Гарком комсамолу займаўся пытаньнямі чыгуначнага транспорту 2 разы.

27-га чэрвеня на бюро гаркому абгаварвалася пытаньне аб ходзе выкананьня пастаноў партыі па транспорту, але да гэтага часу рашэньня ня вынесена. Так было ў першы раз.

У другі раз пытаньне аб рэалізацыі загаду т. Андрэева разглядалася на бюро гаркому 31-га кастрычніка. І гэта называецца „опэрацыйным кіраўніцтвам"!?

Пазачарговы пленум парткому КП(б)Б Гомель—гаспадарчая на пытаньню аб працы комсамольскага колектыву дэпо пастанавіў: „ня глядзячы на своечасовыя дырэктывы з боку парткому, комсамольскі колектыў ня здолеў стаць на чале кіраўніцтва комсамольскай організацыі дэпо, а паасобныя комсамольцы нават разлажыліся". Пленум парткому адзначыў, што комсамольскія організацыі стаялі ў баку ад падрыхтоўкі да пленуму ЦК КП(б)Б, адзначыў наяўнасьць опортуністычных развражаньняў, нежаданьне працаваць і г. д. і на падставе ўсяго гэтага, пастанавіў распусьціць бюро колектыву.

У гэты-ж час газэта „Палеская праўда", у нумары ад 20 лістапада, ва ўсю шырыню паставіла пытаньне аб ліквідацыі прарыву ў рабоце комсамольскіх організацый на транспорце.

У артыкуле „Ганебны прарыў" газэта паказвае рад прыкладаў, якія характарызуюць работу комсамолу чыгункі як абоз бальшавіцкіх тэмпаў работы на транспорце.

Газэта з усёй рашучасьцю патрабуе палепшыць опэрацыйнае кіраўніцтва з боку гаркамолу.

Як рэагуе на гэта гаркамол?

Замест мобілізаваць увагу ўсёй організацыі на гэтых прарывах замест конкрэтнай дапамогі, замест рэагаваньня на сыгналы друку, на пастанову пленуму парткому, бюро гаркому 23-га лістапада выносіць пастанову: „Заслухаўшы інформацыю аб ходзе рэалізацыі рашэньняў гаркому аб становішчы на транспорце і рашэньні бюро парткому аб роспуску бюро комсамольскага колектыву 9 вучастку цягі, бюро гаркому адзначае наяўнасьць некаторага зруху ва ўсёй працы комсамольскага колектыву". У гэтай-жа пастанове бюро гаркому не згаджаецца з пастановай парткому аб роспуску бюро колектыву.

Дзе-ж некаторы зрух у рабоце колектыву, таварышы гаркомаўцы?

Няўжо у тым, што распалася комсамольская брыгада, што не працуе комсамольскі паравоз, што актывісты зьяўляюцца прагульшчыкамі, што загад т. Андрэева не рэалізуецца? Няўжо у тым, што важнейшыя пастановы ЦК ЛКСМБ не даводзіліся да мас

Мы ня можам згадзіцца з такою ацэнкай, як ня можам згадзіцца і з тым, што гарком комсамолу прайшоў міма сыгналаў „Палескай праўды".

Мы разглядаем такую ацэнку работы колектыву дэпо як імкненьне змазаць саўпраўдную рэчаіснасьць, як жаданьне „па-сямейнаму уладзіць справу, як спробу ня прызнаць адсутнасьць кіраўніцтва комсамольскай організацыяй на транспорце з боку гаркому.

Мы у гэтым тым болей упэўнены, што, ня глядзячы на рашэньне гаркомолу ад 31-га кастрычніка аб тым, каб усе члены бюро гаркамолу прымацаваліся да чыгуначных ячэек, ўсе бюро на чале з т. Камісарчыкам, за выключэньнем інструктара т. Раўкіна у чыгуначных ячэйках нават ня бывае.

Такім чынам усе гэтыя факты досыць выразна сьведчаць аб тым. што гомельскі гарадзкі камітэт комсамолу опортуністычна недаацаніў важнасьці перабудовы комсамольскай работы на транспорце, ня выканаў рашэньняў бюро ЦК ЛКСМБ і ЦК УсеЛКСМ аб ўдзеле комсамолу ў рэконструкцыі транспорту і кіраўніцтве з боку мясцовых організацый.

К.—р



Харкаўскі трактарны

Апошнія навіны

Скарачаецца вытворчасьць

РЫГА. Усе гумовыя заводы Латвіі скарачаюць вытворчасьць На заводзе „Квадрат" прадбачыцца поўны перапынак у працы на тэрмін ня менш м-цу.

Француская ваенная экспэдыцыя карае „непакорлівыя плямёны"

ПАРЫЖ. Агенцтва „Радыё" паведамляе, што францускі аэроплян, які вылецеў з Капаблянкі (Марокко) з 2-ма ваеннымі лётнікамі быў прымушаны зьнізіцца ў раёне „непакорлівых плямён" на поўдзень ад Атласу, дзе зараз дзейнічае француская ваенная экспэдыцыя. Аэроплян быў захоплены туземцамі. Лётнікі забіты.

Масавыя ўцёкі беспрацоўных

Буржуазны друк прымушаны адмовіцца ад хлусьлівых заяў

ГЕЛЬСІНГФОРС. Фінляндзкі друк паведамляе аб масавых перабежках беспрацоўных праз савецкую мяжу. Пры гэтым газэты прымушаны констатаваць, што СССР з свайго боку не прадпрымаў ніякай вярбоўкі рабсілы ў Фінляндыі, як гэта імкнуліся сьцьвярджаць некаторыя буржуазныя газэты

Комуністы галасавалі супроць ураду

ПАРЫЖ. Вотум давер'я францускаму ўраду быў прыняты на пасяджаньні палаты 26 лістапада 327 галасамі супроць 151. У ліку галасаваўшых супроць ураду былі комуністы, соцыялісты і некаторыя дэпутаты, якія належаць да розных дробных „левых" партый. Радыкалы ад галасаваньня ўстрымаліся.

Японскія акупанты „зьнімаюць з сябе адказнасьць"

ТОКІЁ. Як паведамляе „Сым бун рэнго" міністэрства замежных спраў Японіі 24 лістапада паведаміла Лігу нацый, што ў выпадку „нечаканай" сутычкі кітайскіх і японскіх войск у раёне Цзіньчжоў адказнасьць будзе ўскладзена на Кітай, які концэнтруе там свае войскі, што пагражае бясьпечнасьці японскай арміі і рэзыдэнтаў у зоне Паўднёва-Манчжурскай чыг.

За практычны ўдзел у конкурсе нізавога друку

Комсамольскія камітэты Менску, уключайцеся ў правядзеньне масавых мерапрыемстваў да конкурсу

Рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена“ узяла на сябе абавязак правесьці ў лютым рад практычных масавых мерапрыемстваў, якія-б забясьпечвалі шырокі і актыўны ўдзел у конкурсе комсамольскай організацыі, мас юнкораў і нізавага маладзёжнага друку. Як-то: у сьнежні і студзені высылаем 5 брыгад у розныя раёны, улічваючы іх спэцыялізацыю. Праводзім 5 зьлётаў юнкораў і дзьве нарады на прамысловых цэнтрах, з уключэньнем у конкурс нізавога друку 8 зьлётаў па сельскім раёнам з дыфэрэнцыяй правядзеньня і рад іншых мерапрыемстваў.

Комсамольскія колектывы, камітэты і ячэйкі павінны зараз-жа шырока правесьці масавую работу вакол конкурса з юнкорамі па павышэньні ролі нізавога і маладзёжнага друку заводаў, фабрык, саўгасаў, калгасаў і МТС.

З пастановы Менгаркому КСМ аб разгортваньні масавай работы з юнкорамі і ўмацаваньні нізавога друку

Адабраючы мерапрыемствы рэдакцыі „Чырвоная зьмена“ па масавай рабоце сярод юнкораў, бюро Менгаркому ЛКСМБ абавязвае культпроп гаркому КСМ і оргмасавы сэктар рэдакцыі „Чырвоная зьмена“ забясьпечыць своечасовае выкананьне гэтых мерапрыемстваў, абавязаўшы ўсе колектывы і ячэйкі КСМ распрацаваць мерапрыемствы, якія-б забясьпечылі павышэньне ролі комсамолу ў нізавым друку, наладжваньне работы маладзёжных старонак і штодзёнак, кіраўніцтва юнкорамі. Каб кожная КСМ організацыя несла непасрэдную адказнасьць за разгортваньне работы сярод юнкораў, сыстэматычна заслухоўваць ход работы маладзёжных старонак фабрычна-заводзкіх газэт. У бліжэйшыя дні праверыць рэалізацыю сярод моладзі пастаноў рабселькораўскага зьезду, рашуча змагаючыся з недаацэнкай разгортваньня нізавога друку і ролі ў ім юнкораў.

2. Бюро Менгаркому ЛКСМБ абавязвае ўсе колектывы КСМ забясьпечыць актыўны ўдзел юнкораўскіх мас і маладзёжных старонак фабрычна-заводзкіх шматтыражак, штодзёнак і насьценгазэт у сталінскім паходзе і ў ажыцьцяўленьні мерапрыемстваў, вызначаных Менгаркомам і рэдакцыяй „Чырвонай зьмены“.

3. Надаючы выключнае значэньне ўсесаюзнаму конкурсу нізавога друку саўгасаў, колгасаў і МТС, які праводзіцца газэтай „Правда“ для палепшаньня ўдзелу нізавога друку у організацыйна-гаспадарчым умацаваньні колгасаў, абавязаць колектывы КСМ саўгасаў і колгасаў і вытворчых колектываў, якія трымаюць над імі шэфства, зараз-жа распрацаваць мерапрыемствы, каб забясьпечыць удзел комсамольскай організацыі і маладзёжных старонак гэтых газэт у конкурсе.

4. Для падвядзеньня папярэдніх вынікаў удзелу юнкораў у сталінскім паходзе і конкурсе па організацыйна-гаспадарчаму ўмацаваньню колгасаў, а разам з гэтым для перабудовы работы комсамолу па ўдзелу ў нізавым друку і масавай работы сярод юнкораў, лічыць неабходным правесьці 25-XII-31 г. агульна-раённую гарадзкую конфэрэнцыю па гэтых пытаньнях.

Колектывам ЛКСМБ забясьпечыць праз выкананьне ўсіх вышэйпералічаных мерапрыемстваў сыстэматычную падрыхтоўку да гэтай конфэрэнцыі.

5. Абавязаць колектывы КСМ распрацаваць гэтую пастанову на чарговых саюзных днях.

6. Абавязаць комсамольскую ячэйку МенАППу забясьпечыць шырокі ўдзел сяброў ячэйкі ў падрыхтоўцы да конфэрэнцыі юнкораў праз наладжваньне дапамогі фабрычна-заводзкім газэтам.

Пакуль ня скованы дарогі маразамі

выканаць пляны рамонту і будаўніцтва дарог

Пропагандысты самацёку і дэзэртырства з фронту дарбуду

Комсамольская організацыя шкло заводу „Ноўка“ абавязалася ўключыцца ў штурм бездарожжа і на кожнага комсамольца даць ня менш, як па два мэтры грабарных работ.

Пастанова, аднак, засталася на паперы. Практычна ня зроблена амаль нічога. За ўвесь будаўнічы сэзон комсамольцы заводу „Ноўка“ не адрамантавалі ніводнага мэтра дарогі.

Комсамольскі колектыў не зьвяртае ўвагі нават на дарогу, якая вядзе ў самы завод. У бездарожж па ёй нельга праехаць, загразаюць фурманкі, зрываецца дастаўка матар'ялаў на завод. Комсамолія заводу чамусьці ня лічыць сваім абавязкам адрамантаваць дарогу, а таксама выканаць той абавязак, які ўзяла на сябе ў барацьбе з бездарожжам.

Ул, Крэсік

Аўтадораўцы, уключайцеся ў выкананьне соцумовы „Ч. З.“ са „Сменай“

На дагавор „Чырвонай Зьмены“ з газэтай Ленінградзкага комсамолу —„Смена“ па выкананьню плянаў дарожнага будаўніцтва павінны шырока адгукнуцца грамадзкасьць, профсаюзныя організацыі і асабліва таварыства Аўтадору.

Аўтадораўцы сваім практычным удзелам у выкананьні пастаўленых „Чырвонай Зьменай“ задач; (барацьба з цякучасьцю рабочай сілы, палепшаньне школ і курсаў Дарбудвучу, папаўненьне іх лепшымі комсамольцамі аўтадораўцамі, організацыя работы ў зімовы час і г. д.) —павінны дапамагчы комсамолу па-бальшавіцку іх рэалізаваць.

Цэнтральнае праўленьне Аўтадору заклікае ячэйкі і раённыя праўленьні абгаварыць задачы, высунутыя „Ч.З:“, і ў цесным сувязі з комсамольскай організацыяй рэалізаваць іх па-бальшавіцку.

Ірвінік

3907 працадзён для дарбуду

Любаньскай комсамольскай організацыяй 24-25 лістапада быў праведзен суботнік па ліквідацыі бездарожжа.

На суботніку працавала 3907 чал, з іх—колгасьнікаў 1100 чал. а комсамольцаў 180 чал.

За час суботніку адрамантавана значная колькасьць мастоў і дарог

Варноўскі.

Менскі акамсамолены ФЗВ „КІМ“— адказвае сормаўцам

Уздымем марксысцка-ленінскае выхаваньне на ўзровень новых задач, правядзем месячнік агляду

Сормаўская комсамольская організацыя нядаўна зьвярнулася да ўсіх організацый з прапановай правесьці месячнік агляду марксысцка-ленінскай вучобы. Гэтая адозва асабліва сваячасова і мае вялікае значэньне таму, што стан палітвучобы комсамольцаў яшчэ нездавальняючы.

Першым у БССР адгукнуўся конкрэтнымі абавязкамі комсамольскі камітэт ФЗВ КІМ, Менск. Мы заклікаем усе комсамольскія організацыі БССР, па прыкладу баявога колектыву ФЗВ КІМ, шырока абгаварыць адозву комсамольцаў Сормава (надрукавана ў „КП“ ад 24-га лістапада) і адгукнуцца практычнымі мерапрыемствамі ў адказ на выклік сормаўцаў.

Уключаемся ў агляд марксыцка-ленінскай вучобы

Наша комсамольская організацыя ФЗВ КІМ пад кіраўніцтвам партыі ўцягвае рабочую моладзь у актыўнае соцыялістычнае будаўніцтва, прыняла ў апошнія часы сотні новых комсамольцаў. Наш ФЗВ у асноўным акомсамолены, Атрад маладых комсамольцаў патрабуе цяпер узмацненьня марксыцка-ленінскага выхаваньня.

У марксыцка-ленінскім выхаваньні важнейшае значэньне мае палітадукацыя, бо „марксысцка-ленінскае выхаваньне будуецца на ўзаемным абагачэньні тэорыі і рэволюцыйнай практыкі для пасьпяховай барацьбы пролетарыяту за пабудову новага грамадзкага ладу“ (Постышаў).

Без асваеньня тэорыі марксызму-ленінізму комсамол ня можа працаваць па-новаму. Адсюль неабходна ўзброіць рэволюцыйнай тэорыяй навічкоў-комсамольцаў, узьняць комсамольскі актыў на больш высокі тэорэтычны ўзровень.

Нашы гурткі ФЗМ КІМ маюць ня дрэнны вопыт работы: усе гурткі ўключыліся ў соцспаборніцтва па ахопу і якасьці палітвучобы. Значна палепшыўся склад пропагандыстых і кіраўнікоў гурткоў.

Комсамольскі камітэт ФЗВ КІМ абгаварыў зварот комсамольцаў Сормава. З 1-га сьнежня па 1-е студзеня праводзім агляд марксысцка-ленінскай вучобы па нашым колектыве. У месячнік агляду абавязуемся правесьці наступнае:

Ахапіць усіх комсамольцаў сеткаў палітвучобы.

Аб'явіць спаборніцтва між ячэйкамі і гурткамі на лепшую работу гурткоў. Узяць пад асобы нагляд вучобу комсамольцаў навічкоў і комсамольскага актыву. Організаваць для актыву ячэек (сэкратароў культпропаў і г. д.) сэмінары. Раз у месяц праводзіць з актывам нарады па асобных тэорытычных пытаньнях.

Для навічкоў організаваць ня менш аднаго разу ў месяц гутаркі старых бальшавікоў для перадачы маладому пакаленьню традыцый бальшавізму.

Для павышэньня якасьці вучобы пачаць кампанію па ўкараненьню новых, вышэйшых форм соцспаборніцтва. Выпусьціць палітпазыку, рэалізуючы яе ў кожнай ячэйцы і палітгуртку.

Програма палітвучобы складаецца з 2-х ступеняй. 1-я ступень для палітгурткоў навічкоў-комсамольцаў (удзельнічае 19 гурткоў) і 2-я ступень—гурткі бягучай палітыкі (5 груп).

Кожнаму комсамольцу выдаем на рукі купон, дзе паказаны тэмы програмы. Кіраўнік гуртка, пасьля распрацоўкі кожнай тэмы, робіць адзнаку на купоне аб якасьці прапрацоўкі.

Програма гурткоў разьлічана на 9 з пяткаў. Уся праца па рэалізацыі палітпазыкі ў ячэйках праводзіцца шляхам соцспаборніцтва і ўдарніцтва ўнутры саміх гуртк... Лепшым гуртком будзе лічыцца то... што выканае програму і сустрэчны... наказчыкі палітпазыкі.

Пасьля рэалізацыі палітпазы... праводзяцца паміж гурткамі, ал... ведна іх палітрэзьвіцьцю, палітба...

Такія-ж палітбаі будуць пра... дзены і паміж ячэйкамі. Пот... падагульняецца рэалізацыя палітпа... зыкі па ўсім комсамольскім кам... тэце.

Пераможцам ячэйкам і гу... ком, таксама лепшым комсамольц... якія ўсвоілі програму і выкана... свой вытворчы плян, будуць выд... дзены прэміі.

Прыдаючы вялікае значэньне пр... верцы, абвешчанай комсамольц... Сормава, мы выклікаем усе коле... тывы і ячэйкі КСМ уключыцца ... агляд. Мы выклікаем на соцспабо... ніцтва у лепшым правядзеньні ... ляду комсамольскія організацыі ... ФЗВ БССР.

Камітэт ЛКСМБ ФЗВ КІМ
(Менск

Парт'ячэйка—на дапамогу рэалізацыі палітпазыкі

Пераняcем вопыт Сормаўцаў

Я, член камуністычнае партыі—адгукаюся на выклік старых бальшавікоў, рабочых заводу Сормава, перадаваць політычныя веды нашаму маладому пакаленьню—комсамольцам навічкам.

Я з вялікай ахвотай вазьмуся за гэту справу і абяцаю прымаць актыўны ўдзел у рэалізацыі палітпазыкі. Заклікаю ўсіх партыйцаў вытворчасьці, інструктароў фабзавучу актыўна дапамагчы комсамолу ў ленінскай вучобе і перадаць свой вопыт рэволюцыйнай барацьбы, вопыт будаўніцтва соцыялізму. У прыватнасьці выклікаю пасьледваць майму прыкладу тав. Розэнбэрга—майстра фабзавучу.

ЛЕМБЭРГ.

Прымаю выклік

Я, Розэнбэрг, улічваючы важнасьць выхаваньня маладых комсамольцаў, і як стары рабочы, са здаваленьнем прымаю выклік тав. Лембэрга і абавязваюся свой вопыт і веды перадаць маладым комсамольцам.

Выклікаю пасьледваць майму прыкладу інструктара т. Шульца і намесьніка дырэктара—тав. Позьняка.

РОЗЭНБЭРГ.

Там, дзе палітвучоба ... вышыні задач

Пры Прудзіяскай ячэй... КСМ організавана палітшко... Дзякуючы масавай рабо... палітшкола ахапіла акра... 7 комсамольцаў яшчэ 24 ча... колгаснай бядняцкай молад...

Палітшкола працуе рэгуля... на—раз у пяцідзёнку. У... праведзена 5 заняткаў. Тэ... „Політыка партыі на вёсц... распрацавана. Дзякуюч... добраму мэтоду вучобы, у... слухачы прымаюць актыўн... ўдзел у занятках. Фактаў зры... ву заняткаў ня было.

У школе шырока разгорну... та соцспаборніцтва і ўдарні... тва між слухачамі. Наша па... літшкола выклікала на спабор... ніцтва Валынецкую палітшко... лу на лепшую ўвязку палі... вучобы і конкрэтную работ... па організацыйна-гаспадарч... му замацаваньню колгасаў.

Ю. Росны.

Стварыць умовы для работы маладзёжнай с.-г. станцы...

Ліст у рэдакцыю „Чырвоная Зьмена“

На Цэнтральную сельска-гаспадарчую станцыю моладзі пры ЦК ЛКСМБ ускладзены вялікія задачы. Сельска-гаспадарчая станцыя моладзі—опэрацыйны штаб комсамолу ў яго барацьбе за соцыялістычную рэконструкцыю сельскай гаспадаркі, за організацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне колгасаў. Станцыя моладзі павінна дапамагчы комсамольцам і моладзі аўладаць агротэхнікай буйнай соцыялістычнай сельскай гаспадаркі і шырока разгарнуць дасьледча-рацыяналізатарскі рух моладзі на МТС, ў саўгасах і колгасах.

Паводле пастановы ЦК ЛКСМБ, к 1-му сьнежня 1931 г. трэ' было ва ўсіх раёнах організаваць раённыя сельска-гаспадарчыя станцыі моладзі. Але гэта работа сарвана, бо раённыя зямельныя аддзелы і райколгассаюзы недаацэньваюць гаспадарчай ролі маладзёжных станцый, ігнорують іх. Організавана толькі 11 станцый, але і тыя не працуюць, бо ня маюць ні сродкаў ні памяшканьня для вытворча-дасьледчай работы. Райземчасткі ня ўключылі ў раённы бюджэт маладзёжныя сельска-гаспадарчыя станцыі, чым яўна ігнорують пастанову колегіі НКЗБ ад 16-га лютага г. г.

Нельга абыйсьці маўчкі паводзін кіраўнікоў Інстытуту соцрэконструкцыі сельскай гаспадаркі, якому мы падпарадкаваны. Маладзёжная с.-г. станцыя ня мае спэцыялістых. Мы ня раз прасілі кіраўніцтва інстытуту дапамагчы ў нашай рабоце сваімі спэцыялістымі, ўвязаць масавую работу аддзелу інстытуту з работай маладзёжнай станцыі. І што-ж? Усе нашыя просьбы засталіся бе... увагі. Інстытут не дапамог.

Кіраўніцтва Інстытуту соцрэко... струкцыі пашло нават далей,—... выкінула маладзёжную станцыю ... яе пакою ў калідор, і зараз ста... цыя зусім не працуе.

Мы зварочваемся да газэты „Чыр... воная Зьмена“ з просьбай дапама... чы нам зламаць перашкоды ў раб... це, стварыць адпаведныя ўмовы для... работы станцыі, дабіцца каб кіраў... ніцтва НДІ, райземчастак, райко... гассаюзу і зональных станцый ... памаглі маладзёжнай станцыі раз... гарнуць навукова-дасьледчую рабо... ту ў саўгасах, колгасах і МТС.

З компривітаньнем Станкевіч, Альховік, Галабурка

ВЫСОКІЯ ТЭМПЫ ІЛЬНААПРАЦОЎКІ СТЫМУЛЯВАНЫ

…авесьці да кожнага калгасьніка і калгасьніцы прогрэсыўна прэміяльную сыстэму аплаты

…есячнік апрацоўкі і здачы лёну дзяржаве падыходзіць …канцу.

…сьпехі яго будзе рашаць прэміяльна-прогрэсыўная …лічына, згодна пастановы Колгасцэнтру і Наркомзему.

…канаць гэту пастанову, узьняць тэмпы апрацоўкі і …льнавалакна і пянькі—неадкладная задача ячэек.

Яч. „Дзяржынскага"—перадавая

…сьскія ячэйкі Вушаччыны …ры барацьбы за лён. Нала… …уботнікі з удзелам беспар… …олгаснай моладзі, складзены …а апрацоўцы ільнавалакна, …цам разгарнулі у брыгадах …бою соцспаборніцтва на хут… апрацоўку лёну, стварылі …а маладзёжную брыгаду і …ля праверкі цьвёрдых за… кулацка-заможнай часткі, … насьценгазэту, каб ась… …ход месячніку. Намечаныя …рапрыемствы былі поўнась… …цяўлены. Колгас Дзяржын… …наў плян здачы ільнатрасты на 100 проц. Зараз комсамольская ячэйка прыкладае ўсе сілы, каб да 10 сьнежня выканаць плян здачы ільнавалакна на 80 проц.

Ячэйка пры колгасе „Бальшавік" сваім актыўным удзелам у месячніку дабілася таксама 100 проц. здачы трасты дзяржаве.

Бюро РК асудзіла опортуністычную бязьдзейнасьць гэтых 2-х ячэек, абвясьціла сэктаром вымовы і прапанавала неадкладна разгарнуць работу, расставіць усіх комсамольцаў, арганізаваць ударныя брыгады па апрацоўцы і здачы ільна дзяржаве.

Л. Замскі.

…ь-трапальныя пункты перавесьці на прэміяльна-прогрэсыўную зьдзельшчыну

…Колгасцэнтр, у дадатак …най пастановы аб (аплаце) апрацоўку лёну і пянькі …пастанову, якою абавязалі …айколгассаюзы ў 3-хтыд… …ін ўвесьці ва ўсіх ільна… …канапляводчых колгасах …рогрэсыўна - прэміяльную …ыну на мяльна-трапаль… …пунктах.

…това прапануе выдаць авач… колгасьнікам і колгасьні… …працавалі на трапаньні …з-жа пасьля здачы ільна… …з разьлікy: за кожны …рапанага валакна № 16 і …20 р., № 12-16—17 р., …—14 р., № 8-10—11 р., …7 р., № 4-6—4 р.

…ыкам, якія працавалі на …ялках, выдаць авансу 7 р …р, на конный цяве—3 р., …—2 р.

…ычыкам за тону сушанай …ыдаць 75 кап.

… гэтага, установлена гра… …эмія за цэнтнэр трапанага …кна № 16 і вышэй—5 р. …—4 р. і № 10-12—2 р. …тнэр апрацаваны ручною … прэміі выдаецца 2 р., а …це на конный цязе—75 кап

За мяцьцё і трапаньне пянькі ўстаноўлен аванс у лік працадзён: за адборны гатунак—17 р., за першы гатунак—15 руб., другі гатунак—11 р., трэці гатунак—9 руб.

За кожны апрацаваны на мяльцы цэнтнэр пянькі, колгасьнікам і колгасьніцам выдаецца прэмія: за адборны гатунак—6 р., першы гатунак—5 р., другі—3 р. трэці—2 р.

НКЗБ і Колгасцэнтр пацьвердзілі сваю ранейшую пастанову аб тым, што прэмтавары за здачу ільнавалакна павінны выдавацца выключна колгасьнікам і колгасьніцам, якія фактычна апрацоўвалі лён.

Якасьць (нумарнасьць) атрапанага ільнавалакна павінна адпавядаць якасьці трасты (прыкладна 2 з паловай нумары трасты павінны даць 14 нумар лёну). Каб выканаць гэту ўмову і ўзьняць якасьць апрацоўкі лёну і пянькі, усім колгасам неабходна вылучыць спэцыяльных прыёмшчыкаў. У выпадку дрэннай якасьці звароччаць для дааапрацоўкі.

Пастанова НКЗБ і Колгасцэнтру аб увядзеньні прогрэсыўна-прэміяльнай зьдзельшчыны зьяўляецца магутным стымулам для павышэньня тэмпаў ільнаапрацоўкі.

Забясьпечыць ільназавод сыравінай

Шклоўская організацыя КСМ яшчэ не пераключылася на выкананьне важнейшых дырэктыў партыі і ўраду аб апрацоўцы і здачы лёну дзяржаве. Раённы плян па загатоўцы ільнавалакна на 20-XI выканан усяго толькі на 9,5 проц. Частка колгасаў ганебна зрывае пляны нарыхтовак. У Чарнаруцкім с-савеце было засеяна 598 га лёну, з якіх колгасамі 410. Апрацоўка гэтага лёну праходзіць надзвычай марудна. Колгас „Чырвоны Кастрычнік" засеяў 92 га лёну, а абмалаціў толькі 20 га, для сушкі прыстасавана ўсяго адна баня. У колгасах „Новы строй", „Чырвоная зорка", „Ленінскі Шлях" зусім зрываецца апрацоўка. Праўленьне колгасу „Ленінскі шлях" выдала па 60 снапоў кожнаму колгасьніку. Колгасьнікі і цяпер апрацоўваюць свой лён, а колгасны пакінулі неапрацаваным. У колгасе „Фрунзэ", Гарадоцкага с-с, праўленцы дадумаліся зрыць ільном стрэхі.

Комсамольскія ячэйкі гэтых колгасаў не прымаюць ніякіх мер для правядзеньня месячніку, абвешчанага ЦК КП(б), не організавалі брыгад па апрацоўцы лёну, не ўвялі зьдзельшчыны.

У раёне ёсьць буйны ільназавод, дзе працуе 240 чал. На гэтым заводзе дрэнна організавана праца. Пануе абязьлічка, ўраўнілаўка ў зарплаце, не ўведзен гаспадарчы разрахунак. Сярод рабочых не разгорнута масавая праца, не наладжана грамадзкае харчаваньне. Завод не забясьпечан сыравінай. Партыйна-комсамольская організацыя заводу не паслала у колгасы і с-саветы ніводнае брыгады на організацыі апрацоўкі і здачы лёну на завод.

Комсамол Шклоўшчыны павінен да 10-XII выканаць плян на 70 проц.

Альховік.

На конфэрэнцыі МенАПП

Вячэрняе паседжаньне конфэрэнцыі МенАПП 28 лістапада распачалося прывітальнай прамовай т. Ахрэмчыка ад аб'яднаньня мастакоў.

Проф. Піотуховіч агаласіў прывітаньне конфэрэнцыі, прынятае на літаратурным вечары рабочых Сталінстану, які (вечар) быў прысьвечаны конфэрэнцыі МенАПП.

Справаздачу аб рабоце сэкратарыяту МенАПП зрабіў адказны сэкратар МенАПП т. Александровіч.

Конфэрэнцыя заслухала даклад т. Кучара на тэму—паказ гэрояў пяцігодкі пролетарскай літаратуры.

Пастанова Бюро ЦК ЛКСМБ

аб выкананьні рашэньняў кастрычнікаўскага пленуму ЦК УсеКП(б) і пастановы Бюро ЦК УсеЛКСМ аб разгортваньні савецкага гандлю і палепшаньні рабочага забясьпечаньня

1. Прапанаваць усім ГК, РК і ячэйкам ЛКСМБ зараз жа прапрацаваць рашэньні пленуму ЦК УсеКП(б) і пастановы ЦК УсеЛКСМ аб разгортваньні савецкага гандлю і палепшаньні рабочага забясьпечаньня, давёўшы іх да кожнага комсамольца і маладога рабочага.

На працягу першай паловы сьнежня правесьці масавыя зьлёты комсамольцаў і беспартыйнай моладзі, якія працуюць у кооперацыі, шырока прыцягваючы ударнікаў з вытворчасьці. Правесьці рэйды па праверцы выкананьня ўсімі зьвеньнямі кооперацыйных організацый рашэньняў партыі, рашуча змагаючыся са ўздуваньнем цэн, прасоўваньнем нядобраякасных тавараў, прымусовых асортымэнтаў, незахаваньнем санмінімуму і г. д.

ГК і РК устанавіць пэрыядычнае правядзеньне гэтых рэйдаў.

2. Абавязаць Менскі, Віцебскі, Гомельскі ГК, Бабруйскі, Барысаўскі, Магілёўскі, Аршанскі і іншыя РК ЛКСМБ—у дэкадны тэрмін праверыць стан рабочага забясьпечаньня вядучых профэсій, змагаючыся з імкненьнямі да ўраўнілаўкі.

3. Адзначаючы, што адкормачныя пункты пры сталоўках організуюцца ўяўна нездавальняюча як па колькасьці, так і па якасьці, што комсамольскія організацыі слаба ўдзяляюць на гэтым вучастку, абавязаць усе колектывы і ячэйкі ЛКСМБ зрабіць круты пералом у практычным удзеле па павялічэньню гурту і палепшаньню догляду за ім, усямерна заахвочваючы лепшых комсамольцаў—сьвінароў (прэміяваньне і г. д.)

4. На гаспадарчы разрахунак з 95 буйнейшых магазынаў пераведзена: на БКС—25, Белгандлю—6, ТПО—3. Такое становішча яўна нездавальняючае. Комсамол кооперацыі не ўлічыў важнасьці ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі па гаспадарчым разрахунку і не забясьпечыў мобілізацыі мас на выкананьне гэтых задач.

Абавязаць усе ГК і РК ЛКСМБ забясьпечыць сапраўдную дапамогу і актыўны ўдзел усіх зьвеньняў КСМ організацый ў пераводзе кооперацыі на гаспадарчы разрахунак і зьдзельную аплату.

5. Комсамольская організацыя яшчэ не зрабіла патрэбных крокаў для аўладаньня тэхнікай гандлю.

ЦК ЛКСМБ прапануе Менскаму, Віцебскаму. Гомельскаму РК організаваць кожнаму з іх ня менш 2-х гурткоў па вывучэньню таваразнаўства, асортымэнту тавараў, тэхнікі гандлю і гаспадарчага разрахунку. Бабруйскаму, Магілеўскаму, Барысаўскаму, Рэчыцкаму, Аршанскаму, Полацкаму інш РК організаваць ня менш аднаго гуртка у кожным раёне, прыцягнуўшы да наведваньня гурткоў усіх комсамольцаў і моладзь, якія працуюць у кооперацыі. Пры буйнейшых сталоўках організаваць гурткі па аўладаньню тэхнікай загатоўкі абедаў і і інш.

6. Пастанова ЦК ЛКСМБ аб організацыі комсамольскіх магазынаў выконваецца слаба (з 18 організавана 9) Абавязаць ГК і РК ЛКСМБ у бліжэйшы 2- дэкадны тэрмін выканаць гэту пастанову ЦК, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на якасьць работы комс. магазынаў і дабіцца каб яны сталі ўзорнымі для астатніх магазынаў; разам з гэтым правесьці адпаведную работу па організацыі комсамольскіх сталовак.

7. Комсамольская організацыя слаба змагаецца за якасьць выпусканых тавараў. Абавязаць комсамольскія організацыі Белшвэйаб'яднаньня, Скурсындыкату і Белкустпрому дабіцца карэннага палепшаньня сваёй продукцыі, выкрываючы конкрэтных вінаватых браку ў імянных сьпісах, якія вывешваць у магазынах і прадпрыемствах.

Абавязаць комсамольскія колектывы і асобных комсамольцаў, якія працуюць у сетцы грамадзкага харчаваньня дабіцца поўнага ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі аб пераўтварэньні сталовак у цэхі прадпрыемства. Мобілізаваць усю грамадзкасьць, і ў першую чаргу комсамольцаў, якія працуюць у сталоўках, на поўнае ажыцьцяўленьне санмінімуму (набыцьцё плявацельніц, урнаў і інш.), разгортваньне культработы (радыё, газэты і г. д.), пасіленьне тэмпаў самазагатовак. Абавязаць комсамольскія колектывы заводаў „Комунар", „Рухавік рэволюцыі", „Чырвоны мэталіст" палепшыць якасьць выпусканай продукцыі для грамадзкага харчаваньня. Менскаму, Гомельскаму і Барысаўскаму ГК узяць пад асобны нагляд працу ў гэтых колектывах.

9. ГК і РК організаваць пры сталоўках ЗРК, Гарпо, ТПО і магазынах комсамольскія ячэйкі. У 2-х дэкадны тэрмін організаваць пры ўсіх ячэйках ЛКСМБ магазынаў і сталовак гурткі політчытак, ахапіўшы імі ўсіх комсамольцаў і беспартыйную моладзь.

10. Адзначаючы зусім нездавальняючае становішча з комсамольскай праслойкай у кооперацыйных організацыях, асабліва ў ТПО і Белгандлі, прапанаваць ГК і РК ЛКСМБ у дэкадны тэрмін выканаць разьвёрстку аб мобілізацыі 200 комсамольцаў на кооперацыйную работу. Масава-экономічнаму аддзелу праверыць, як усе райкомы выконваюць даную пастанову, і на контрольным сэкратарыяце далажыць аб гэтым.

Прапанаваць ГК і РК, колектывам і ячэйкам ЛКСМБ наладзіць сталае кіраўніцтва комсамольцамі, якія працуюць у праўленьнях, рэўкамісіях ЗРК, Гарпо, ТПО, Лесрабкоопу, цэхавых коопбюро, лавачных і сталовых камісіях, выслухоўваючы іх даклады на бюро, і адчыненых сходах ячэек. Вытворчым колектывам дабіцца павялічэньня і высоўваньня соцкамесьнікаў, наладзіўшы іх работу па ажыцьцяўленьню працы кооперацыйнага апарату.

Непасрэдны нагляд у галіне савецкага гандлю і рабочага забясьпечаньня ўскласьці на т. Сапега, а ГК і РК ускласьці адказнасьць за правядзеньне гэтай работы на аднаго з членаў бюро ГК і РК ЛКСМБ.

Паўторна, праз месячны тэрмін праверыць выкананьне гэтай пастановы.

…А ПАРАДАК ДНЯ ПЛЯНАВА-ОПЭРАЦЫЙНЫХ ГРУП—

барацьбу за плян 4-га заключнага

…ДЗЯРЖПЛЯН БССР і ДОМ НАВУКІ ЗРАБІЦЬ ЦЭНТРАМ КІРАЎНІЦТВА ПЛЯНАВЫМ РУХАМ

…гачыся за выкананьне пяці… …ў…галы, ленінскі комсамол …ну… новыя, вышэйшыя формы …ычнага спаборніцтва—пля… …-опэрацыйныя групы.

…я ленінскі комсамол ужо …уе …і толькі над выкананьнем …фі…пляну за паасобных прад… …ах, але і над дзяржаўным …народна-гаспадарчым плянам" (Ко…).

…пляна-опэрацыйныя групы ахоп… …цэха праца прадпрыемства за дру… …перакідваецца ў саўгасы і …а паглыбляе свой зьмест, …а магутным рухам мас за …не плянамі.

…пляна-опэрацыйныя групы— …першая жыцьцём форма ўдзелу …мас у плянаваньні, і перш …усё палепшаньні нізавога пля…ньня.

…а машына-будаўнічым заводзе …„Кому…" налічваецца 10 плянава… …цыйных груп, з ахопам 105 … Групы дабіліся ўжо значных …пехаў у барацьбе з беспляна… …цю, за плянавае забясьпечаньне …ыльмікаваньне дэталяй, за про… …ыўна-зьдзельную аплату працы …гаспадарчы разрахунак.

…ясячныя пляны сыстэматычна …зяцца да кожнага цэху, брыга… …кожнага рабочага. Па ініцыятыве …пляна-опэрацыйных груп на …заводзе ўведзена пашпартызацыя …станкоў і галоўных інструмэнтаў. …ьмі…аштоўнае пачынаньне зра…групы, увёўшы ў некаторых цэхах і брыгадах 10 хвілінныя вытворчыя нарады перад пачаткам працы, сыгнальныя дошкі, карты вучоту, прымацаваньне дэталей да варштату і г. д.

Магчыма прывесьці яшчэ цэлы рад фактаў конкрэтнай працы плянава-опэрацыйных груп у барацьбе за плян.

Разам з посьпехамі ў працы плянава-опэрацыйных груп, ёсьць і значныя недахопы.

Да апошняга часу групам заводаў „Комунар" і Варашылава, якія складаюцца з рабочых—плянавікоў, ударных брыгад, партыйна-комсамольскія, профэсыянальныя організацыі і плянавыя аддзелы заводаў не дапамагаюць у барацьбе за ўнутрызаводзкае, цэхавае і брыгаднае плянаваньне.

Амаль ва ўсіх групах падыход агульны:—не ўлічваюцца ўмовы працы прадпрыемства і нават цэху, важныя пытаньні глыбока не прапрацоўваюцца з прычыны тэхнічнай няпісьменнасьці, некаторыя групы працуюць бяз пляну і сыстэмы, дарослыя рабочыя прымаюць слабы ўдзел у іх працы

Плянава-опэрацыйныя групы на гэтых заводах амаль выключна комсамольска-маладзёжныя.

Некаторыя з іх, па сутнасьці,—ні плянавыя, ні опэрацыйныя, бо сыстэматычна не працуюць над складаньнем плянаў, не зьдзейсьняюць кантроль над яго выкананьнем

Толькі „пры дастатковым кіраўніцтве гэтыя плянавыя брыгады стануць творцамі здаровых бальшавіцкіх плянаў", Куйбышаў)

Вось чаму плянавыя органы заводаў, фабрык і партыйна-комсамольскія організацыі павінны аказваць практычную дапамогу і кіраўніцтва плянава-опэрацыйным групам. Дзяржплян БССР і Дом Навукі і Тэхнікі павінны організаваць сыстэматычную консультацыю і кіраўніцтва плянава-опэрацыйным рухам.

Ад агульнага кіраўніцтва плянава-опэрацыйнымі групамі трэба перайсьці да конкрэтнага, дыфэрэнцыяванага кіраўніцтва—па галінах прамысловасьці.

Плашчынскі

Не дапусьціць зрыву

работы ў кузьні комсамольскіх кадраў

Адзінай школай падрыхтоўкі комсам. кадраў зьяўляецца аднагадовыя курсы комсамольскага актыву пры Комвузе Беларусі імя Леніна.

У гэтым годзе павінна быць прынята 120 чал. Аднак, ня гледзячы на неаднакратныя катэгорычныя пастановы ЦК ЛКСМБ, разьвёрстка на курсы гаркомамі і райкомамі ня выканана, і падрыхтоўка комсамольскіх працаўнікоў знаходзіцца над яўнай пагрозай зрыву.

Заняткі павінны былі пачацца 20-га гэтага месяцу, аднак, на курсы зьявілася ўсяго каля 45 чал.

Асабліва ганебна зрываюць пасылку Менскі Гарком, які замест 20 чал. даў на курсы 5 чал., Гомель з 13 патрэбных прыслаў 5 чал. Мазыр з 7 чал.—1 чал, Полацак з 7—ніводнага чал Ня лепш выканана разьвёрстка і па іншых раёнах, як Бабруйск, Ворша, Рэчыца, Барысаў.

Мы патрабуем ад ЦК прыцягнуць да адказнасьці гэтыя раёны, прыняць больш рашучыя захады для забясьпечаньня работы курсаў комсамольскага актыву.

Асаблівую ўвагу таксама неабходна зьвярнуць на якасьць камандыраваных таварышоў. Актыўных кіруючых работнікаў комсам.-партыйцаў мы абавязаны паслаць на курсы комсамольскага актыву.

С.

Атрады японскіх войск, авіяцыйныя эскадрыльлі і кавалерыйскія атрады

сьцягваюцца на кітайскай тэрыторыі

Японская ваеншчына імкнецца зрабіць Манчжурыю сваёй колёніяй

Разгортваюцца ваенныя дзеяньні

Мужчынская частка насельніцтва мобілізавана

ТОКІЁ, 28. Савет міністраў сёньня ўхваліў накіраваць у тэрміновым парадку яшчэ 500 салдат у Цьзян-Цзін з складу Квантунскай арміі. У Цьзян-Цзіне, па словах японскіх крыніц, працягваецца перастрэлка. Мужчынская частка насельніцтва японскай канцэсіі мобілізавана для ўдзелу ў ваенных дзеяньнях.

* * *

ТОКІЁ 28. Як паведамляе „Сімбун рэнго" з Мукдэна, полк, які падрыхтаваўся да выступленьня з Мукдэну ў раён Цзін-Чжоу, атрымаў тэрміновы загад аб адмене адпраўкі.

ШАНХАЙ 28. Атрад японскіх маракоў, накіраваны з Таку, прыбыў у Цзян-Цзін.

* * *

ШАНХАЙ 28. Па паведамленьню агенцтва Гомінь японскія войскі ў колькасьці 3 тысяч з Фуфуня і 2 тысячы з Чаньчуня працягваюць прасоўвацца на Бэйпін-Мукдэнскай чыгунцы. У Мукдэн прыбыла з Карэі авіяцыйная эскадрылья і новая кавалерыйская брыгада.

Хлусьлівыя заявы аб эвакуацыі

Эвакуююцца хворыя японскія салдаты

ШАНХАЙ 28. Агенцва Гомінь паведамляе, што заява зробленая ў Парыжы Іосізавай аб тым, што Японія пачала эвакуацыю войск з Цыцыкару—хлусьлівая, бо частковая эвакуацыя войска з Цыцыкара выклікана проста тым, што японскія салдаты не пераносяць халадоў і загэтым японскі вайсковы ўрад быў прымушаны накіраваць у Мукдэн салдат, якія патрабуюць мэдыцынскай дапамогі.

Згода Нанкіна

ШАНХАЙ. 28. Нанкін афіцыйна заявіў аб сваёй згодзе з пастановай савету Лігі Нацый адносна ўстанаўленьня нэйтральнай зоны ў Цьзінчжоу

Абвержана японская вэрсыя „аб аграмаднай концэнтрацыі кітайскіх войск"

ПАРЫЖ. 28. Адзіны атрыманы дагэтуль саветам Лігі нацый даклад ваеннага аташэ ў Бэрліне абвяргае японскую вэрсыю аб аграмаднай концэнтрацыі кітайскіх войск у раёне Цзін-Чжоу. У дакладзе ўказваецца, што ў гэтым раёне знаходзіцца ўсяго толькі 23 тысячы кітайскіх войск і ніякай далейшай концэнтрацыі не назіраецца.

* *

ТОКІЁ, 28. Агенцтва „Сімбун Рэнго" з Цьзян-Цзіну паведамляе, што зьнішчальнік „Асагао" учора высадзіў 100 матросаў, якія ўвечары прыбылі ў Цьзян-Цзін.

Ван-Шу-Чжан катэгарычна адхіліў патрабаваньні Японіі аб расброеньні кітайскай паліцыі і ўказаў на тое, што кітайскія войскі адведзены ад чыгункі на 20 лі (лі—0,6 кілёметра) і не прадпрымалі ніякіх варожых дзеяньняў у адносінах японскіх войск. Дзеяньні кітайскай паліцыі,—заявіў Ван-Шу-Чжан, — былі выкліканы неабходнасьцю барацьбы са змоўшчыкамі.



У вялікім андрэеўскім дзварцы ў Крамлі адбылося ўрачыстае ўручэньне верыцельных грамат старшыні УсеЦВК СССР тав. Калініну новапрызначаным францускім пасолом у СССР—графам Дежанам.

На здымку, зьлева направа т. т.; Літвінаў, Калінін і францускі пасол граф Дежан.

НА ШАХМАТНА-ШАШАЧНЫМ ФР…

З гэтага моманту аднаўляецца выхад шахматна-шашачнага Аддзел ставіць сабе мэтаю:

1. Асьвятленьне праверкі рэалізацыі рашэньня ЦК УсеКП(б), ЛКСМ і IX-га Зьезду УсеЛКСМ аб фізкультурнай працы ў галіне… рыўнае часткі фізкультурнага руху—шахматна-шашачнай працы.
2. Павышаць шахматна-шашачныя веды чытачоў як ў галіне… най гульні, так у галіне композыцыі.

Аддзел будзе выходзіць адзін раз ў пяцідзёнку.

Рэдакцыя зварочваецца да ўсіх чытачоў з просьбай дасылаць… аб ходзе перабудовы працы шахматна-шашачных гурткоў на завод… рыках, у колгасах, саўгасах: як увязваецца шахматна-шашачная… фізкультурнай і агульнай культмасавай працай, а разам з імі з… чай працай, як выконваюцца СФК і гаррайпрофсаветамі пастанов… ганізацыйным узмацненьні шахматна-шашачных сэктароў і шахм… шачных сэкцый, як праводзяць шахматна-шашачныя арганізацыі… з праявамі профэсіяналізму, рэкордсмэнства, чэмпіёнства і інш… просьба дасылаць свае партыі, орыгінальныя задачы, этуды, канцо…

БССР на ўсесаюзных спаборніцтвах

З 10-га кастрычніка па 21-е лістапада у Маскве адбываліся ўсесаюзныя шахматна-шашачныя спаборніцтвы, у якіх прымала ўдзел каля 500 ігракоў. Характэрным адрозьненьнем гэтага зьезду ад папярэдняга зьяўляецца тое, што у ім удзельнічалі прадстаўнікі ўсіх нацыянальных рэспублік і вельмі высокі процант пролетарскай моладзі, гэта бязумоўна сьведчыць аб тым, што зацікаўленасьць шахматамі і шашкамі рабочай моладзі няўхільна ўрастае.

Ад Савецкай Беларусі ўдзельнічала у спаборніцтвах 17 асоб. У шахматным турніры: Касьперскі, (комсамольцы — Мазэль і Верасаў (Менск), Сташэўскі (Магілёў), Падольны (Полацак), Сіліч (Віцебск). Лепш за ўсіх з беларускіх шахматыстых выгралі—Мазель, —адзіны з БССР, які папаў у фінал, і малады таленавіты полацкі шахматысты Падольны, якому не хапала да атрыманьня права ўдзелу 1-2 ачка. У фінале ш-ш сэкцыі ЦСПСБ Мазэл… высокае месца, на падст… яму прысуджана пажыцьц… не майстра. У шашачным… прымала ўдзел 8 белару… шыстых. Лепш за ўсі… Бэрлінкоў—студэнт Віцеб… літэхнікуму. Храпуновіч —малаўыя в цебсія ш… комсамолец з менскіх ваг… стэрняў—Ракітніцкі і ра… воду „Варашылава"—Гард…

У камандных профсаю… борніцтвах прымалі ўдзел… шыстыя. З іх добра выгра… молец хлебазаводу (Мен… Шварц.

Па агульных выніках п… тах Беларусь выграла гор… і Ленінграда, але выйшла… УССР, ЗСФСР, УзССР. Па… Беларусь заняла 3-е месца… РСФСР і УССР.

Размовы і ніякай работы

На нізавы друк у Тальскім сельсавеце Любаньскага раёну не зьвяртаюць увагі. У насьценгазэце прымае ўдзел зусім малая колькасьць сьценкораў. У радзе колгасаў насьценгазэты выходзяць толькі раз у месяц.

Асноўныя пытаньні дня, як барацьбу за організацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне колгасаў, насьценгазэты ўпускаюць.

РК КП(б)Б павінен прыцягнуць да адказнасьці опортуністых, якія недаацэньваюць работу нізавога друку.

Шпакоўскі.

Рэдкалегія бязьдзей…

Насьценгазэты ў колгаса… гасах павінны адыграць… ролю ў мобілізацыі рабочы… гасных мас на організацы… падарчае ўмацаваньне колг…

Зусім ня так гэта ў… „Зьвязда" Старобінскага… Рэдколегія за ўвесь час вы… толькі адзін нумар насьц… ніякай культмасавай пра… колгасьнікаў не праводзіць.

Партыйная і комсамольск… ка павінны зацікавіцца пра… колегіі насьценгазэты колгас… да" і дапамагчы ёй ажыві… ту, пераключыўшы ўсю… на разгортваньне конкурсу… друку на організацыйна-г… чаму ўмацаваньню колгасаў.

Ю…

С. Ліхадзіеўскі, Б. Мікуліч

Ударнік у літаратуры

Першы зборнік мастацкай творчасьці 16-ці рабочых—ударнікаў, заклікаx у літаратуру „Ўдарнікі" (ДВБ, 1931, цана 75 кап.) зьяўляецца адным з рэальных вынікаў разгортваньня культурнай рэволюцыі ўглыб, зьяўляецца сьведкай таго, што мы на шляху да сьціраньня розьніцы паміж інтэлектуальнай і фізычнай працай.

МенАПП, як частка БелАПП—вялучага атраду ўсёй сёньняшняй савецкай літаратуры БССР, ахапіўшы сваімі гурткамі каля 200 ударнікаў, мае новае дасягненьне—творчасьць рабочых-ударнікаў, якія непасрэдна зьвязаны з вытворчасьцю.

Што характэрна ў творчасьці рабочых аўтараў?

А тое, што цэнтральнай тэмай іхніх вершаў, апавяданьняў, нарысаў зьяўляецца наша вытворчасьць прадпрыемства, цэх, рабочае асяродзьдзе, ударныя брыгады, барацьба за прамфінплян.

Сьвежым струменем творы рабочых ударнікаў у нашай літаратуры зьяўляецца тым больш таму, што рабочая тэматыка ў нашых пісьменьнікаў далёка не займае таго месца, якое яна павінна займаць.

У творчасьці ўдарнікаў Швэйдэля, Шаўцова, Малышэнкі дый шэрагу іншых удзельнікаў гэтага зборніку бачым зусім новы падыход да падачы вытворчага процесу, да апісаньня людзэй. У нарысе Шаўцова „Чырвонасьцяжвы" вобраз рабочага колектыву паказаны праз асобных сваіх прадстаўнікоў, якія змагаюцца за выкананьне прамфінпляну, якія намагаюцца авалодаць—і авалодваюць—тэхнікай. Аўладаньне тэхнікай у падачы Шаўцова—ня голы тэхніцызм, ня тэхніка для тэхнікі, што ёсьць у шмат-якіх пісьменьнікаў,—Шаўцоў выразна разумее тое, што тэхніка патрэбна для больш пасьпяховага будаўніцтва соцыялістычнай індустрыі. Весь менавіта ў процесах стварэньня новай, соцыялістычнай індустрыі нараджаецца новы чалавек, процес стварэньня соцыялістычнай вытворчасьці формуе якасна новы характар, сьвядомасьць чалавека. Новы чалавек, перамагаючы старыя свае звычкі, што засталіся ў спадчыну ад капіталістычнага ладу, па новаму асэнсоўвае працу, і яна становіцца для яго—справай гонару, мужнасьці і геройства.

У гэтым сэнсе надзвычайна характэрнымі зьяўляюцца апавяданьні Швэйдэля („Фотографія") і Лейбмана („Заява"). Рвач Залатых з „Фотографіі" падпадае пад абстрэл комсамольскага колектыву. Нават Ганка якую ён любіць адыходзіць ад яго, ганьбуе яго як рвача. Залатых пачынае разумець свой учынак, але канчатковае асэнсоўваньне рвацтва прыходзіць значна пазьней, тады, калі гэты ўчынак пераходзіць у сваясаблівы антаганізм, у нянавісьць да сакратара комсамольскага колектыву Дразда, асэнсоўваньне прыходзіць позна, тады, калі Залатых канчаткова адрываецца ад комсамольскага колектыву. Ня вырашыў да канца Швэйдэль узятай проблемы, узяў прыватны выпадак.

У гэтых адносінах пасьлядоўней Лейбман. У апавяданьні „Заява" паказваецца пераробка Карпеля, які дужа падобен на Швэйдэлева персонажа, але пераробка гэтая даводзіцца да канца. Карпель перавыхоўваецца. Праўда трэба сказаць, што паказ перавыхаваньня Карпеля ў Лейбмана дужа хуткі, дужа схэматызаваны.

Асноўнае, чым характарызуецца проза зборніка „Ударнікі"—тое, што большасьць аўтараў пішуць аб комсамоле.

І Швэйдэль („Сэнс жыцьця" і Малашэнка („Выхаванец комсамолу") і Эстэркін („Мішка Базарынаў"), і Фэльдман („Комсамольскі інтэрнат") матар'ялам для твораў бяруць штодзённае жыцьцё, побыт, барацьбу за прамфінплян комсамольскіх організацый.

Трэба спадзявацца, што маладыя рабочыя пісьменьнікі ў новых творах дадуць яшчэ глыбейшы, усебаковы паказ комсамольскіх герояў—энтузіястаў.

Вобраз майстра, які аддана працуе на карысьць вытворчасьці і якога рабочыя любяць і шануюць, дае Б. Гольман у апавяданьні „Рост" і важна тое, што майстра Зоргнера аўтар не адрывае мэханічна ад рабочых мас, а бярэ яго ў цесным супрацоўніцтве, узаемасувязі з колектывам, адначасна ня стушоўваючы яго індывідуальнасьці, як організатара і кіраўніка.

Сярод аўтараў вершаваных твораў зборніка маем Бацюшкова, Малашэнку, Коршака, Нортмана, Давідовіча, Яўкімава, Мацееўскую, Мысьлінчыка, Красоўскага.

І вершы, як і проза, напісаны на актуальныя тэмы жыцьця вытворчасьці (прарыў, ударніцтва і інш).

Праўда трэба сказаць, што ня ўсе аўтары яшчэ дасканала авалодалі тэхнікай вершаў, перад усімі ім яшчэ стаіць пытаньне чыстаты мовы.

Мацнейшымі вершамі ў зборніку ёсьць вершы М. Бацюшкова. Ніколі „не вакілзацца мне ў струны поэцікаў гітарных"—гаворыць малады поэта:

Трэба каб песьня
штурхала да молата рукі.
Трэба каб песьня
забівала ў рыштоўку цьвік.

Такая асноўная ідэя верша „На бой! на бой!".

Сьвежым і орыгінальным зьяўляецца верш гэтага-ж аўтара „З бальшавіцкім напорам і сілай—у бой за сілос!"

Бадзёрыя вершы і ў Нортмана і Малашэнкі і ў інш. аўтараў.

Трэба гаварыць аб сур'ёзнай вучобе рабочых-ударнікаў, заклікаx у літаратуру. Падвышэньне ўзроўню дыялектыка-матэрыялістычнага сьветапогляду—першачарговая задача перад маладымі аўтарамі.

Трэба падтрымаць думку, высунутую на конфэрэнцыі МенАПП праз стварэньне спэцыяльнага часопісу („хоць-бы накшталт расійскага Роста"), які-б адначасна дапамагаючы ў вучобе рабочых аўтараў, зьмяшчаўбы і іхнія творы.

Нашай крытыцы трэба больш увагі аддаваць творчасьці ўдарнікаў, правільна зазначаючы на зрывы ў гэтай творчасьці, дапамагаючы аўтарам у далейшым росьце, пазьбягаючы „сюсюканьня" у гэтай справе, што прыкладна маем у Кучара (артыкул у „Зьвяздзе" пра нарыс „Новы цэх варашылаўцаў"), у Кабакова (артыкул у „Полымі" № 6-7 г. г.) і інш.

Трэба нарэшце зазначыць і на тое, што МенАПП і да апошняга часу яшчэ не наладзіла сталай літаратурнай консультацыі для рабочых-ударнікаў.

Варта адзначыць і тое, што зборнік „Ударнікі" ўдарнымі комсамольскімі брыгадамі друкарні імя Сталіна надрукаваны ў працягу 5 дзён.

Без адбору—усіх па… жын

У Віцебскім раёне слаба… нута барацьба за соцыяліс… жывёлагадоўлю. Рад колга… падрыхтаваўся к зіме. Аб… ЦК КП(б)Б 2-х месячнік лі… прарываў у соцыялістычнай… гадоўлі праведзены слаба. … лісты і Вэтінстытут зусім … чыліся ў выкананьне ко… задач 2-х месячніку.

Па раёне значна недавыка… комплектаваньня гурту буйн… тай жывёлы. Саўгас „Падб… замест 100 галоў паставіў … 93. „Сасноўка" з патрэбн… мае 73 гал., „Мопр" зам… гал. мае 178.

Комплектаваньне саўгасн… ту павінна ісьці за лік адб… шых кароў з бойні. Але, … бойні, Фёдараў, і ветурач… Шталь зрываюць адбор лепш… роў, пускаючы іх пад нож. … ма і саўгасы ня ўжываюць … ным мер, каб своечасова … для саўгасу лепшых кароў … Бывае так, што адабраныя кар… некалькі дзён стаяць на бой…

Саўгасы і колгасы у… шасьці не падрыхтаваны д… Не ацеплены аборы. ня скл… кармовыя балансы. І больш … колгас „Шлях соцыялізму" … працаваў адозвы ЦК і СНК … віцьці соцжывёлагадоўлі.

Саўгасы раёну не ажыцьц… указаньняў т. Сталіна. Зьд… прэміяльная аплата працы н… дзена, не ліквідавана абязьлі…

А. Хваёвы Л. Б…

Нам. адказн. рэдактара С. А…

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38. Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэл. № 903. ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Друкарня імя тав. Сталіна.

Упаўнаважаны Галоўлітбелу № А—2522